**А.І.Саломка,** *дацэнт*

# ПРАБЛЕМЫ ВЫХАВАННЯ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

Вядома, што амаль чвэрць насельніцтва Рэспублікі Беларусь складае моладзь, ад маральнага складу якой залежыць будучае дзяржавы. Сацыялізацыя асобы працякае ўсё жыццё, але асабліва інтэнсіўна ажыццяўляецца ў тым узросце, калі малады чалавек набывае спецыяльнасць, актыўна ўключаецца ва ўсе сферы жыцця грамадства. Падрыхтоўка спецыяліста мае на ўвазе не толькі авалоданне комплексам ведаў, уменняў і навыкаў, але і выхаванне грамадзяніна з устойлівай патрыятычнай, гуманістычнай пазіцыяй, усведамленнем сваёй адказнасці за эканамічнае, палітычнае і духоўнае развіццё грамадства. Такім чынам, перад намі стаіць задача не толькі падрыхтоўкі якаснага спецыяліста, але і фарміравання сацыяльна, духоўна і маральна сталай асобы супрацоўніка інфармацыйна-дакументных камунікацый, які разумее каштоўнасці і ідэі беларускай дзяржаўнасці і які здольны ўдзельнічаць у пабудове моцнай, квітнеючай дзяржавы.

Культура ва ўсе часы была і застаецца магутным фактарам, што аказвае ўплыў на фарміраванне духоўнага свету чалавека. Вядома, што без духоўнай культуры няма ні сацыяльнай, ні матэрыяльнай культуры. Асновай духоўнай культуры з'яўляецца нацыянальная культура. Веды аб нацыянальнай культуры – адна з неабходных умоў эфектыўнага ўздзеяння на асобу. Актывізацыі ўвагі да пытанняў выхавання моладзі на нацыянальных традыцыях і гісторыі свайго народа настойліва патрабуе сучасны этап нацыянальна-дзяржаўнага і культурнага развіцця Беларусі.

Гісторыя беларускай кнігі – частка нацыянальнай культуры. Яна – сродак фарміравання кнігазнаўчай і агульнай культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры будучых спецыялістаў, іх гістарычнага мыслення, інтэлектуальнага, духоўнага развіцця. Вывучэнне гісторыі беларускай кнігі садзейнічае выхаванню нацыяльнай самасвядомасці, якая ўключае нацыянальныя патрыятычныя пачуцці, пачуццё нацыянальнай годнасці і адказнасці, павагі да іншых народаў. Праз змест дысцыпліны мы імкнемся забяспечыць прафесійную падрыхтоўку студэнтаў, а таксама ўзбагаціць іх духоўна. У працэсе выкладання гісторыі кнігі фарміруецца паняцце аб вышэйшых ідэалах служэння Радзіме. Беларуская кніга разглядаецца як феномен еўрапейскага культурнага працэсу, як арганічная частка культуры чалавецтва. Гісторыя кнігі паказвае, што беларускі народ у сваім культурным развіцці не знаходзіўся на задворках Еўропы, а займаў пачэснае месца. Узнікненне на тэрыторыі Беларусі рукапіснай (як і друкаванай) кнігі не выпадае з агульных працэсаў развіцця кнігі ў свеце і практычна на адстае ад іх. Звернемся да прыкладаў. У Еўропе пачатак кнігадрукавання датуецца прыблізна сярэдзінай XV ст. Ужо з пачатку кнігадрукавання сваё слова сказаў выдатны майстра друку Ян Ліцьвін (Джон Летоў). Гэта ён побач з Вільямам Кекстанам, які ў г.Вестмінстэры ў 1476 г. паставіў першы станок у Англіі, заснаваў першую тыпаграфію ў Лондане ў 1480 г. і выдаў там тры кнігі, што па паліграфічных якасцях былі вышэй за кекстанаўскія выданні, а затым у Бельгіі надрукаваў чатыры кнігі. Асвойваў друкарскае майстэрства Ян Ліцьвін у 1478 - 1479 гг. у Рыме.

З мэтай выхавання студэнтаў, фарміравання ў іх нацыянальнай самасвядомасці і павагі да сваёй гісторыі, жадання працаваць на карысць Радзімы мы імкнемся выкладаць гісторыю кнігі, грунтуючыся на агульным уяўленні аб працэсе гістарычнага развіцця нацыі. У той жа час звяртаем увагу на асаблівасці і тэндэнцыі развіцця менавіта кнігі ў той ці іншы час, падзеі і выключныя факты яе бытавання, на гістарычныя асобы, якія ўздзейнічалі на кніжную справу і лёс народа. Трэба адзначыць, што велізарныя выхаваўчыя магчымасці маюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераломныя моманты ў гісторыі беларускага народа і развіцця кнігі, звязаныя з грамадска-культурным уздымам, адраджэннем, пашырэннем нацыянальна-вызваленчых ідэй. Менавіта тады вызначаюцца найбольш яркія постаці ў кніжнай справе. Веданне іх жыцця і працы садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў паняцця аб вышэйшых ідэалах служэння Радзіме. Асобае месца сярод іх, безумоўна, займае постаць Францыска Скарыны, першадрукара Беларусі і ўсіх усходніх славян, гуманіста, асветніка і патрыёта. Біблія, выдадзеная ім на роднай мове, дарэчы выйшла ў свет раней за нямецкую Біблію Марціна Лютэра (1522-1549). Шэдэўр выдавецкага майстэрства не згубіўся ў агульнай масе выданняў таго часу. 50 прадмоўяў і 61 пасляслоўе Ф.Скарыны нясуць ідэалагічныя прыметы таго часу. Ф.Скарына развіваў усходнеславянскія культурныя традыцыі, якія заклалі хрысціянскія асветнікі Кірыла і Мяфодзій, а на бацькаўшчыне – Е.Полацкая і К.Тураўскі. Гуманістычныя традыцыі Ф.Скарыны ў сваю чаргу былі прадоўжаны буйнейшымі прадстаўнікамі рэфармацыйнага кнігадрукавання С.Будным і В.Цяпінскім (Амеляновічам), а затым друкарамі-братчыкамі, якія сталі і прамымі наследнікамі скарынаўскіх друкарскіх дошак, што выкарыстоўваліся першадрукаром у Вільні. Пазней дзейнасць В.Дуніна-Марцінкевіча, К.Каліноўскага, дзеячаў суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца" і іншых, таксама як і Радзівілаў, Л.Сапегі, Астрожскіх, Р.Хадкевіча, прасякнута ўвагай да маральна-этычных праблем, духоўнага ўдасканалення чалавека, да пашырэння асветы і прагрэсу.

Узоры самаадданага служэння свайму народу дала гісторыя беларускай кнігі на ўсіх этапах свайго развіцця. Так, у гады Вялікай Айчыннай вайны поўнымі гераізму, драматызму, а часам і трагізму было выданне перыёдыкі (газета "Звязда" і інш.), лістовак (Вера Мацкевіч і інш.), кніг. Нацыянальна-патрыятычная скіраванасць дзейнасці ў галіне кнігадрукавання набывае сёння выключнае значэнне для развіцця духоўнай культуры беларускага народа і садзейнічае фарміраванню ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтаў гуманістычнай сістэмы каштоўнасцей, выхаванню пачуццяў патрыятызму, прыхільнасці нацыянальным традыцыям.

Не менш значныя гуманістычныя традыцыі ўвабралі ў сябе іншамоўныя кнігі, у тым ліку лацінамоўныя, яўрэйскія і арабскія, якія друкаваліся на нашых землях. Вывучэнне гэтай часткі кніжных багаццяў дае магчымасць выхоўваць павагу да здабыткаў культуры іншых этнічных груп, якія жылі і жывуць на тэрыторыі Беларусі.

У працэсе выкладання дысцыпліны мы звяртаем увагу на сацыякультурныя, палітычныя ўмовы яе бытавання, на тэматычны і моўны склад кніжных масіваў у той ці іншы перыяд і паказваем праз канкрэтны матэрыял, што гісторыя беларускай кнігі – гэта гісторыя вострай барацьбы беларускага народа за сваё існаванне, за права "людзьмі звацца", за сваю мову і культуру.

Разглядаючы сучасны стан кнігавыдання ў Беларусі, мы робім акцэнт на прававым полі яго развіцця, вывучаем заканадаўчыя і нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць, а значыць, ствараюць адпаведныя ўмовы для развіцця нацыянальнай кнігі.

Каб працэс выкладання і яго вынікі зрабіць больш прадукцыйнымі, выкарыстоўваюцца розныя формы, метады і сродкі навучання. Праводзяцца традыцыйныя маналогавыя лекцыі, выкарыстоўваецца метад праблемнага выкладання. Ужываюцца прыёмы эмацыянальнага ўздзеяння праз выкарыстанне пэўных фактаў, з'яў і тэндэнцый у гісторыі кнігі. Актыўна выкарыстоўваецца наглядны матэрыял: арыгінальныя кнігі, факсімільныя выданні, паштоўкі і іншы ілюстрацыйны матэрыял, а таксама відэафільмы.

Дыялагічны метад навучання выкарыстоўваецца на семінарскіх занятках, пры гэтым звяртаецца асаблівая ўвага на выпрацоўку ў студэнтаў умення аналізаваць факты, з'явы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рабіць адпаведныя высновы. Зараз распрацоўваецца семінар, прысвечаны сучаснаму стану развіцця кнігавыдання ў Беларусі.

Вялікую цікавасць выклікаюць у студэнтаў экскурсіі ў выдавецтвы і буйныя бібліятэкі г. Мінска і іх аддзелы рэдкіх кніг. Там студэнты знаёмяцца са здабыткамі не толькі айчыннай, але і замежнай кніжнай культуры і разам з ведамі атрымліваюць эстэтычнае задавальненне, дзякуючы іх выдатным паліграфічным і мастацкім якасцям.

На жаль, выкарыстанню новых метадаў выкладання ў значнай ступені замінае слабая ўкамплектаванасць неабходнай літаратурай бібліятэкі і вучэбных кабінетаў, фонды апошніх ужо шмат гадоў перасталі папаўняцца новай літаратурай. Зараз значная колькасць гадзін аўдыторных заняткаў выдзелена на самастойную работу, але на кантроль за ёю час скарацілі, хаця новыя метады патрабуюць шмат часу на падрыхтоўку выкладчыка і кантроль за падрыхтоўкай студэнтаў, асабліва першага курса. А менавіта яны і вывучаюць дзве ўзаемазвязаныя вучэбныя дысцыпліны: "Сусветную гісторыю кнігі" і "Гісторыю беларускай кнігі".

---

1 *Владимиров Л.И.* Литовец Джон Леттоу – лондонский первопечатник // Книга: исследования и материалы. – М., 1973. – Сб. 26. – С.183–190.

2 *Козачихина Н.В.* Идеалы как форма направленности личности // Профессиональное сознание специалиста: методологические, идеологические, психолого-педагогические факторы формирования: материалы российско-белорусской науч.-практ. конф., г. Минск, 21–23 апр. 2004г. – Мн., 2004. – С.183–185.

3 *Кулько Е.И.* Духовность и нравственность: основы личности будущего специалиста // Профессиональное сознание специалиста: методологические, идеологические, психолого-педагогические факторы формирования: материалы Российско-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

белорусской науч.-практ. конф., г. Минск, 21–23 апр. 2004 г. – Мн., 2004. – С.89–90.

4. *Михневич О.А.* Теоретико-педагогические основы формирования национального самосознания будущих учителей. – Мн.: ТетраСистемс, 1996. – 261 с.

5. *Сиверцев Ю.Г.* Идеологическое сопровождение деятельности личности и патриотическое воспитание – основа становления профессионального сознания специалиста // Профессиональное сознание специалиста: методологические, идеологические, психолого-педагогические факторы формирования: материалы Российско-белорусской науч.-практ., конф., г.Минск, 21–23 апр. 2004г. – Мн., 2004. – С.70–71.

**І.П.Скрыпко,** *аспірант*

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ І ДЗЯРЖАЎНАЯ ІДЭАЛОГІЯ

Слова “ідэалогія” ўведзена ў навуку Дэсцютам дэ Трасі ў канцы XVIII ст. Першапачаткова яно абазначала навуку пра ідэю як самастойную галіну ведаў [3], але з цягам часу змяніла свой сэнс. Калі пад ідэяй звычайна разумеецца сукупнасць паняццяў, уяўленняў аб рэчаіснасці ў свядомасці чалавека, якая адлюстроўвае яго адносіны да навакольнага свету або асноўны, істотны прынцып светапогляду, то ідэалогія – гэта сістэма поглядаў, уяўленняў, ідэй якога-небудзь грамадства, класа, палітычнай партыі [1]. Заўважым, што тэрмін “ідэалогія” мае яскрава выражаную палітычную афарбоўку. Р.Арон вызначаў ідэалогію як “глабальную гісторыка-палітычную сістэму тлумачэння свету” [цыт. па.: 2, с.77). Ідэалогія належыць палітыцы, з'яўляецца яе інструментам і знаходзіць сваё выражэнне ў палітычных дактрынах [4]. Паколькі асноўнымі суб'ектамі палітыкі з'яўляюцца дзяржава і ўлада, то слушна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ